# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

30 сакавіка 2018 г. № 13 (446)




стар. 2

Ці пераможны баршчэўнік?



стар. 3

Просім навесці парадак!



стар. 14

Дзіцячы дом ці дзіцячы сад?

ТЭМА ТЫДНЯ

# ДОБРА ТАМ, ДЗЕ ЦЯБЕ ЛЮБЯЦЬ

## Як палепшыць абстаноўку ў сям'і і не дапусціць сацыяльнага сіроцтва



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

**ЯКІЯ сем'і на асаблівым кантролі ў органаў апекі? Каго часцей пазбаўляюць бацькоўскіх правоў? Ці стала ў нас менш сірот? І як часта ўдаецца вярнуць дзяцей у сям'ю? Разбіраемся, як сёння дзейнічае Дэкрэт № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях» і што змянілася за 10 гадоў яго існавання.**

стар. 4

СЛОВЫ І СПРАВА

# УМОВЫ ДЛЯ ПРАДПРЫМАЛЬНЫХ павінны быць камфортныя



## У Магілёве адбылося выязное пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі з нагоды мер, якія прымаюцца па выкананні патрабаванняў Дэкрэтаў № 7 і № 1 Прэзідэнта Беларусі

### Лібералізаваць заканадаўства

Краіне патрэбны новыя прававыя ўмовы для паўнавартаснай рэалізацыі дэкрэтаў, для стварэння працоўных месцаў, прыцягнення інвестыцый і павышэння прадукцыйнасці працы. Такі пасыл зроблены ўсім, ад каго залежыць выкананне гэтых задач на месцах.

— Кіраўнік дзяржавы 2 сакавіка заслухаў службовых асоб па выніках работы ў 2017 годзе і паставіў шэраг адказных задач, — адзначыў **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** — У прыватнасці было сказана, што краіна да 2025 года павінна выйсці на ўзровень валавога прадукту 100 мільярдаў долараў ЗША ў эквіваленце. Гэта вельмі складаная задача, якая патрабуе мабілізацыі ўсіх структур, органаў дзяржаўнага кіравання і, безумоўна, адпаведнага заканадаўчага забеспячэння. Нарматыўна-прававыя акты павінны садзейнічаць выкананню такой важнай эканамічнай задачы. Дзякуючы гэтаму будзе адчувальна палепшаны жыццёвы ўзровень насельніцтва. Парламенту трэба ўнесці ўдакладненні, дапаўненні і змяненні ў 6 кодэксаў, 21 закон, 13 указаў Прэзідэнта і 34 пастановы Саўміна. Гэта патрэбна, каб сур'ёзна лібералізаваць заканадаўства, забяспечыць камфортныя ўмовы для гаспадарчых суб'ектаў.

стар. 2